Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

__________________ Ю.П.Бондар

“____” ________________ 2017 г.

Рэгістрацыйны № ВД _____ / вуч.

**Беларуская драматургія і тэатр**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках).*

Мінск 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на падставе АСВА па спецыяльнасці: 1-18 01 01-2013 Народная творчасць (па напрамках) ад 2013-09-01 і вучэбнага плана рэг. № С17-1-28/13 вуч. ад 27 06 2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*В. С. Варапаева,* прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*В. А. Грачова*, дацэнт кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
*В. В. Лапацінская,* загадчык кафедры літаратуры ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ВУЧЭБНАЙ:**
*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 15.05.2017 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.06.2017 г.).

Адказны за рэдакцыю: ___________
Адказны за выпуск: В. С. Варапаева

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Асноўнай **мэтай** дысцыпліны “Беларуская драматургія і тэатр” з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў разумення “першаснасці слова” і яго рэалізацыя ва ўсіх відах мастацтва (“Спачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог”), у прыватнасці ў драматургіі. Рэжысёрскае мастацтва – мастацтва стварэння гарманічнага цэласнага сцэнічнага твора з дапамогай творчай арганізацыі. Ажыццяўляецца на падставе задумы, інтэрпрэтацыі рэжысёра, узаемадзеяння з іншымі творамі мастацтва, а таксама працы ўсіх удзельнікаў стварэння пастаноўкі: акцёраў, мастака, кампазітара і г. д. Гэта від мастацкай творчасці, які дазваляе стварыць прасторава-пластычнае, мастацка-вобразнае рашэнне задумы твора з дапамогай уласцівых толькі яму выразных сродкаў.

Змест дысцыпліны “Беларуская драматургія і тэатр” вызначаецца яго **задачамі**:

– асэнсаваць паняцці “інтэрпрэтацыя”, “узаемадзеянне” відаў мастацтва;

– выпрацаваць разуменне ролі асобы (чытача / гледача, рэжысёра, музыканта і інш.) у інтэрпрэтацыі літаратурнага тэкста;

– актывізаваць творчае ўяўленне, крэатыўнасць у рэалізацыі пэўнай задумы рэжысёра.

Студэнты павінны **ведаць**:

1) творчасць вядучых беларускіх драматургаў;

2) спецыфіку інтэрпрэтацыі зместу беларускіх драматычных твораў вядомымі рэжысёрамі.

Студэнты павінны **ўмець**:

1) крэатыўна падыходзіць да інтэрпрэтацыі твораў з пункту гледжання іх актуальнасці і змястоўнасці;

2) выпрацоўваць свой погляд на развіццё драматычнага жанру і рэалізаваць яго ў практычнай дзейнасці.

Засваенне вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-3. Забяспечваць шматбаковыя сувязі з грамадкасцю ў працэсе работы, удзельнічаць у распрацоўцы рэкламнай і друкаванай прадукцыі.

ПК-4. Рыхтаваць даклады, паведамленні і іншую дакументацыю ў галіне народнай творчасці і ўдзельнічаць у іх рэпрэзентацыі.

ПК-14. Аналізаваць перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці.

ПК-17. На навуковай аснове арганізоўваць сваю творчую прафесійную дзейнасць, валодаць найноўшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы мастацкай культуры.

ПК-18. Ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-19. Ведаць прынцыпы і прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследванняў у галіне народнай творчасці.

ПК-23. Планаваць рэпертуар уласных мастацкіх (музычных) твораў.

ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва.

ПК-26. Выступаць у якасці акцёра-выканаўцы ў прафесійных і аматарскіх музычных калектывах, драматычных тэатрах, музычных тэатрах, тэатрах-студыях, на радыё, тэлебачанні, у канцэртных установах.

Спецыяліст па напрамкам спецыяльнасці 1-18 01 01-01 “Народная творчасць (харавая музыка)”, 1-18 01 01-02 “Народная творчасць (інструментальная музыка)” акрамя таго, павінен быць здольным:

**Творчая дзейнасць**

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пераклады для харавых калектываў, аркестраў, ансамблей.

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых (інструментальных) калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

Дысцыпліна “Беларуская драматургія і тэатр” цесна звязана з наступнымі дысцыплінамі: “Беларуская літаратура”, “Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра”, “Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства” і інш.

Для студэнтаў спецыяльнасці *1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)* завочнай формы навучання прадугледжана 3 лекцыйныя і 1 семінарскія заняткі (усяго 8 гадзін).

Дысцыпліна “Беларуская драматургія і тэатр” выкладаецца на працягу двух семестраў. Форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. Уводзіны

Прадмет і задачы дысцыпліны “Беларуская драматургія і тэатр”. Роля фальклора ў стварэнні першых драматычных твораў.

### Тэма 2. Беларуская драматычная класіка і яе сцэнічнае жыццё

В. І. Дунін-Марцінкевіч – пачынальнік беларускай драматургіі. Стварэнне лібрэта камічных опер (“Сялянка” (“Ідылія”)). Супрацоўніцтва з С. Манюшкам. Сцэнічны лёс “Пінскай шляхты” (пастаноўкі: оперы Г. Вагнера, Р. Пуксты); пастаноўкі “Пінскай шляхты” М. Пінігіна (Польшча, “Славянскі базар”). Спецыфіка інтэрпрэтацыі літаратурнага зместу.

Спадчына Янкі Купалы і яе тэатральная жыццё (“Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Тутэйшыя”, “Адвечная песня” пастаноўкі Ф. Ждановіча, Л. Ліцвінава і інш.; фільм-спектакль “Паўлінка” рэжысёра Аляксандра Зорхі і інш.).

К. Крапіва і яго роля ў развіцці нацыянальнай драматургіі (“Хто смяецца апошнім”, “Проба агнём”, “Брама неўміручасці” і г. д.). Вырашэнне актуальных праблем на сцэнічных падмостках (пастаноўкі І. Раеўскага, А. Кірэева (тэатр-студыя кінаакцёра)). Спецыфіка інтэрпрэтацыі літаратурнага зместу.

### Тэма 3. Сучасная беларуская драматургія і яе тэатральнае ўвасабленне

Аналіз пастаноўкі оперы “Сівая легенда” музыка Д. Смольскага. Спецыфіка другой рэдакцыі. Рэжысёр М. Панджавідзэ (выкарыстанне камп’ютарнай графікі, занавес, які служыць праекцыйным экранам) і г. д. Спалучэнне і змена дэкарацый і музыкі (сцэнаграфія А. Касцючэнка).

Сцэнічны шлях твораў А. Макаёнка (“Лявоніха на арбіце”, “Зацюканы апостал”, “Трыбунал” і інш.). Пастаноўка ў розных тэатрах.

А. Дудараў. Праблематыка, сцэнічнае жыццё п’ес “Радавыя”, “Вечар”, “Чорная панна Нясвіжа” і інш. Асаблівасці развіцця канфлікту як спосаб развіцця сюжэта і выяўлення характарыстыкі асобы.

Пошук новых жанравых формаў, арыентацыя на творчы эксперымент: сучасная інтэрпрэтацыя (рэмейк класічных твораў беларускай літаратуры на сцэнічных падмостках). Дзейнасць А. Асташонка, Р. Баравіковай, І. Сідарука, Г. Марчука, С. Кавалёва, А. Курэйчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны**
**“Беларуская драматургія і тэатр”**
*для студэнтаў завочнай формы навучання спецыяльнасці:*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках).*

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | сем. | |
| 1. | Уводзіны | 2 | | |
| 2. | Беларуская драматычная класіка і яе сцэнічнае жыццё | 2 | | |
| 3. | Сучасная беларуская драматургія і яе тэатральнае ўвасабленне | 2 | 2 | чытацкія дзённікі; гутарка-дыспут |
| | **Усяго** | 6 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## Літаратура


### *Асноўная*

1. Семяновіч, А. А. Гісторыя беларускай драматургіі XIX – пач XX стст. / А. А. Семяновіч. – Мінск.: Выш. школа, 1985. – 155 с.
2. Сучасная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства / Уклад. і прадм. П. Васючэнкі. Пад агул. рэд. У. М. Сіўчыкава. – Мінск: Сэр-Віт, 2003. – 640 с.

### *Дадатковая*

1. Бельскі, А. І. Драматургія / А. І. Бельскі // Сучасная літаратура Беларусі. – Мінск, 2000. – 127 с.
2. Борщёва, О. Вариации на тему Короткевича: «Седая легенда» белорусской оперы [Электронный ресурс] / О. Борщёва // Беларусский журнал. – 2015. – 8 окт. – Режим доступа: http://journalby.com/news/variacii-na-temu-korotkevicha-sedaya-legenda-belarusskoy-opery-250. – Дата доступа: 20.06.2017.
3. Васючэнка, П. В. Сучасная беларуская драматургія: дапаможнік для настаўнікаў / П. В. Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 158 с.
4. Габбасова, С. Х. Интерпретация и анализ – разграничение подходов [Электронный ресурс] / С. Х. Габбасова. – Режим доступа: http://www.rusnauka.com/14_NPRT_2010/Philosophia/67033.doc.htm. – Дата доступа: 14.06.2017.
5. Есин, А. Б. Интерпретация литературного произведения как теоретическая проблема / А. Б. Есин // Проблемы интерпретации художественных произведений: межвуз. сб. научн. трудов. – Москва: МГПИ, 1985. – С. 3–19.
6. Крапіва, К. Канфлікт – аснова п’есы / К. Крапіва // Зб. тв.: у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 2. – С. 400 – 409.
7. Лаўшук, С. С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С. С. Лаўшук; НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Выд. 2-е. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 252 с.
8. Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыкл., 2002. – 2 т.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендаваных метадаў выкладання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

- гісторыка-тэматычны падыход;
- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.);
- метад-аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарытоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТУРГІЯ І ТЭАТР**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:*

*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар ______________
Тэхнічны рэдактар __________________

**Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.**
**Папера офісная. Рызаграфія.**
**Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. 1,31. Тыраж экз. Заказ .**

**Выдавец і паліграфічнае выкананне:**
**УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».**
**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,**
**распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.**
**ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.**
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.